**«ЕВА́НГЕЛЛЕ НАПРАСТО́ЛЬНАЕ»**, помнік старажытнабеларускага кнігадрукавання. Традыц. Чатырох'евангелле, або Евангелле-тэтр. Выдадзена П.Мсціслаўцам у 1575 у Вільні на царкоўнаслав. мове ў друкарні братоў Мамонічаў. Перадрукоўвалася Мамонічамі 2 разы: 1-ы — у 1600 (за выключэннем пасляслоўя і з невял. розніцай у наборы асобных слоў і радкоў; некалькі спрошчана ў параўнанні з арыгіналам надрукаваны і ўпрыгажэнні); 2-і — у канцы 1600. Тыражы былі даволі вялікія. Выданне 1575 надрукавана фарматам у аркуш буйным шрыфтам рус. паўустава. У кнізе змешчаны гравіраваныя выявы евангелістаў Іаана, Лукі, Матфея, Марка. Мяркуецца, што гэтыя ксілаграфіі рабіў сам П.Мсціславец. Кніга выканана на высокім для таго часу ўзроўні, з'яўляецца ўзорам для шматлікіх евангелічных выданняў бел., рус. і ўкр. друкарняў.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова